Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

# Мішка-прагнюшка

Мядзведзік Мішка набіў цукеркамі кішэні і адправіўся на двор.

Ён грыз цукерку за цукеркай, быццам семачкі.

На арэлях, як заўсёды, гушкалася вавёрачка Пуся. Яна ўбачыла Мішку і апусцілася ніжэй.

— Пачастуй цукеркай, — пачуў мядзведзік голас вавёрачкі.

— А-а-а, гэта ты? — ён спыніўся і зірнуў на Пусю.

— Пачастуй цукеркай. У цябе вунь поўныя кішэні, — зноў папрасіла вавёрачка і падскочыла да Мішкі.

— Мне самому мала. Ведаеш, як я люблю салодкае, — прыкрыў лапамі кішэні мядзведзік.



— Мішка-прагнюшка! — усклікнула Пуся.

Яна паправіла на галоўцы жоўты банцік і скокнула на дрэва.

— Сквапны, — вымавіў бабёр Пузан і нырнуў у ваду.

— Скнара! — сказала рысь Белара і разгойдалася ў гамаку.

— Скнара? — здзівіўся мядзведзік. — Якое цікавае слова.

Толькі сябар Мішкі — лосік Ясік маўчаў. Але чамусьці ён раздражнёна пачаў стукаць капытком па зямлі. Ды так, што з-пад капытка зямля разляталася.

Мішка спалохаўся і пабег дадому.

— Мама, хто такі скнара? — спытаў ён, пляснуўшы дзвярыма.

— Калі звярок нічым ні з кім не дзеліцца, нікога не частуе, усё забірае сабе і яму ўсяго мала — называецца прагнасцю, а звярок лічыцца скнарай, — адказала мама.

— Са скнарамі не хочуць сябраваць! — паглядзеў на ўнука скрозь акуляры дзядуля Міхась. Ад здзіўлення ён паматляў галавой і зноў прыняўся чытаць кнігу.

— Я зразумеў, — уздыхнуў мядзведзік.

— І што ты зразумеў? — спытала бабуля Міхаліна.

— Ды тое, што я не пачаставаў цукеркамі вавёрачку Пусю. І наогул нікога. Усе з'еў сам. Я сапраўды Мішка-прагнюшка, — ціха сказаў мядзведзік.

— Ты ўсе цукеркі з'еў адзін? — пляснула лапамі мама Міла. — Трэба дзяліцца, частаваць сяброў!

Мішка сеў на канапу і панура маўчаў.

Раптам з кухні пачуўся салодкі водар.

— Бабуля, ты зноў штосьці спякла? — спытаў мядзведзік і пабег на кухню.

— Торт з мядовымі карамелькамі, — усміхнулася бабуля і запрасіла ўсіх да стала на чаяванне.

Неўзабаве мядзвежая сям'я з асалодай піла гарбату з тортам. Чамусьці Мішка адсунуў сваю талерачку і, насупіўшыся, пазіраў на дарослых.

— Ты не хочаш торта? — здзівілася мама Міла.

— Хачу, вельмі хачу. Але калі вазьму яго, дык я буду сквапным, — уздыхнуў малы.

— Чаму? — у адзін голас усклікнулі дарослыя.

Мішка моўчкі развёў лапамі.

— Ты няправільна разумееш. Бабуля спякла торт і нас усіх частуе. А калі б не пачаставала, дык гэта было б прагнасцю, — мудра патлумачыў дзядуля Міхась.

— І ты не будзеш Мішкам-прагнюшкам, калі будзеш есці бабулін пачастунак, — дадала мама Міла.

Мядзведзік павесялеў. Ён зірнуў на бабулю Міхаліну і прыняўся есці мядова-карамельны торт.



*Малюнкі*
*Анастасіі СЛІЖУК*